Opłatę pocztową uiszczono ryczałtem.

Цана асобнага нумару 20 грошаў.

НАША ВОЛЯ

Выходзіць два разы у тыдзень.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12—3 (Wileńska 12. m. 6) Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзён. Адміністр. ад 9 да 3.	Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 1 зл. 50 гр. Для заграніцы ўдвая даражэй. Перамена адрэса 30 гр.	Незамоўленыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукаванага залежыць ад Рэдакцыі.	Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 гр. за радок петыту ў 1 шпальту.

№ 1 — Вільня, Пятніца 4-га сакавіка 1927 г. — Год I

„Выраўніваньне сацыяльнага фронту".

Здаецца, ні для кога ня тайна, што крокі, зробленыя з боку Польшчы і Літвы ў кірунку залагоджаньня варожых дагэтуль адносінаў паміж імі, распачаты пад уплывам Англіі. Нікому ня тайна, што, каб аслабіць уплывы радавае палітыкі ў Азіі — перадусім у Кітаі і Індыі, Англія імкнецца да ўтварэньня „процібальшавіцкага валу" на заходняй граніцы СССР, не вагаючыся распаліць тутака ваенны пажар, які прымусіў-бы Радавы Саюз перакінуць свае сілы з Азіі ў Эўропу, ды гэтак аблягчыць сабе барацьбу з закабаленымі Англіяй народамі Азіі.

Англійскія палітыкі працавалі ў гэтым кірунку ўжо даўно, але неяк бяз вынікаў. Думка Англіі аб'яднаць Балтыцкія дзяржавы з Польшчай на процірадавым фроньце разьбівалася ўсьцяж аб дзьве перашкоды: аб непрымірымае становішча Літвы — з аднаго боку, ды аб тыя глыбокія розьніцы сацыяльнага характару, якія істнуюць паміж Польшчай і яе балтыцкімі суседкамі.

Дзеля таго, каб даць раду літоўскаму нацыяналізму, які першым варункам паразуменьня з Польшчай стаўляў заўсёды аддачу Літве Вільні, — спосаб знайшоўся. Вільню Літва атрымаць можа, але... аб'яднаўшыся з Польшчай у адну дзяржаву — ў пастаці польска-літоўскай фэдэрацыі. Цяжэйшай аказалася справа выраўніваньня тых сацыяльных розьніц у дзяржаўным будаўніцтве дзяржаў, намечаных Англіяй дзеля ўтварэньня процібальшавіцкага валу.

Справа ў тым, што маладыя рэспублікі, якія цесным колам абыймаюць СССР з Захаду, апынуліся паміж дзьвюх сацыяльных сыстэмаў, рэзка варожых адна аднэй: капіталістычным Захадам і камуністычным Усходам. Абедзьве гэтыя сыстэмы ў рознай меры ўплывалі на кожную з гэтых рэспублік. Так — побач з пасьлямаёвай Польшчай—мы бачылі сацыялістычныя ўрады ў Латвіі і Літве, бачылі яўна процібальшавіцкую ўладу ў Эстоніі, бачылі пераходы ўлады з рук працоўных у рукі абшарнікаў у Фінляндыі. Але найбліжэйшыя суседкі Польшчы—Латвія і Літва—ў адным паддаліся магутнаму ўплыву рэвалюцыйных павеваў з Усходу: пад той час, як Польшча захавала ў поўнай меры зямельныя прасторы у руках вялікіх зямляўласьнікаў,—і Латвія і Літва падзялілі блізу ўсе абшарніцкія землі паміж працоўным сялянствам, што значна зьменшыла ўплывы на жыцьцё абедзьвюх рэспублік элемэнтаў заможных — перадусім зямельнае буржуазіі, такой сільнай у Польшчы.

Дзеля таго, што, як бачым, у Літве істнавалі ажно дзьве прычыны немагчымасьці дайсьці да згоды з Польшчай, англійская дыпляматыя і зьвярнула свае вочы перадусім на Літву. Справа Вільні можа быць вырашана вышэйпададзеным спосабам. Але дзеля гэтага трэба было ўтварыць у Літве такі ўрад, які быў-бы здольны выраўняць і глыбокія сацыяльныя разыходжаньні паміж суседкамі. Вось чаму тая-ж самая Англія, якая ў імя „ваяўнічага дэмакратызму" Керанскага дапамагла скінуць у Расеі Мікалая II-га, — дапамагла ў Літве скінуць сацыялістычную ўладу—рукамі *фашыстаў*. І фашысты, захапіўшы ўладу ў Літве, распачалі сваё гаспадараваньне тым, што прыпынілі незакончанае яшчэ правядзеньне ў жыцьцё зямельнае рэформы, — прасьцей кажучы—спынілі падзел абшарніцкай зямлі між сялянствам. Далей — пачалася адкрытая барацьба новае ўлады ня толькі з камуністамі, абвешчанымі „ворагамі дзяржавы", але і з усімі прадстаўнікамі сацыяльнага радыкалізму — з сацыял-дэмакратамі на чале. — Так „выраўняліся" сацыяльныя разыходжаньні між пасьлямаёвай Польшчай і Літвой, і — уладзіўшы спрэчку аб Вільню — ўжо нішто ня будзе перашкаджаць уваходу Літвы побач з Польшчай у процірадавы блёк.

На чародзе цяпер стаіць „выраўняньне" сацыяльных разыходжаньняў паміж Польшчай і Латвіяй. Калі гэта ўдасцца, дык можна ўжо будзе приступіць запраўды да ладжаньня „процібальшавіцкага валу".

Паўтараем: *калі ўдасцца...*

Прыгавор у справе Воевудзкага.

Нарэшце так-званы „маршалкоўскі суд" абвясьціў свой прыгавор у справе пасла Незалежнай Партыі Хлопскай Воевудзкага, якога пілсудчыкі абвінавацілі ў тым, быццам ён, ужо будучы дэпутатам, быў адначасна **платным агентам дэфэнзывы і рабіў** дзеля атрымліваных за гэта грошы **даносы на сваіх калегаў—беларускіх паслоў.**

„Суд" гэны быў зложаны з палітычных праціўнікаў Воевудзкага, проці чаго ён дарэмна пратэставаў. Аднак, як кажуць, з пустога і сам Салямон нічога ня выцісьне, — дык і ўсё абвінавачаньне пасла Воевудзкага, падтрыманае віцэ-прэм'ерам Бартлем, на судзе разьвеялася.

„Суд" на падставе дакумантаў сцьвярдзіў **беспадстаўнасьць абвіненьня, быццам Воевудзкі служыў у дэфэнзыве,** займаючы адначасна **становішча пасла.** „Суд" сцьвярдзіў, што ў інфармацыях, якія Воевудзкі даваў II аддзелу генаральнага штабу, як **давераная асоба, няма нічога такога, што насіла-бы характар нейкага даносу на паслоў беларусаў.**

Але пры гэтым усім выявілася адна дужа характэрная рэч: што **на выбарную агітацыю за сьпісак „Вызваленьня" ў Заходняй Беларусі грошы Воевудзкі даставаў... з II аддзелу генаральнага штабу!** Гэтак справа, паднятая пілсудчыкамі проці паківу ўшага іх кумпанію пасла Воевудзкага, зусім неўспадзеўкі ўдэрыла ў партыю „Вызваленьне", скампрамітаваўшы яе на-сьмерць!

І камні загаласілі!

Справа беларускае школы настолькі ўжо насьпела сярод нашага сялянства, што навет на адбытым гэтымі днямі ў Вільні зьезьдзе прадстаўнікоў гмінных рад Віленшчыны („чыста польскай"!) цэлы рад дэлегатаў трэбаваў, каб у ніжэйшых клясах пачаткавае школы вучэньне адбывалася **абавязкова пабеларуску**—у роднай мове дзяцей. Дзіця, якое ня ведае польскае мовы, ідучы ў школу, часта марнуе цэлы год на тое, каб зразумець чужацкую мову, і толькі пасьля зламаньня гэтае перашкоды твoрыцца нейкая магчымасьць дзеля нейкае навукі.

Прадстаўнік віленскага школьнага кураторыуму на гэта адказаў, што ў гэтым кірунку ўжо выданы цыркуляр віцэпрэм'ера Бартля, які загадвае вучыцялём на мясцох **навучыцца тутэйшых моваў** (!). Гэтак вучыцель будзе мець магчымасьць паразумявацца з беларускімі і літоўскімі дзяцьмі ў іх роднай мове.

Заява гэта дужа характэрная, бо паказуе, якім спосабам урад маніцца „разьвязаць" пытаньне аб навуцы нашых дзяцей у роднай мове... Курсы для беларускіх вучыцялёў маюць выпусьціць сваіх гадунцоў толькі ў 1928 годзе! Дый ад сканчэньня курсаў да адчыненьня беларускіх урадавых школаў — яшчэ дужа далёка, як паказаў гэта сумны лёс кракаўскіх курсантаў—беларусаў, парасыланых у польскія школы — па ўсей Польшчы...

Ведама, пытаньне аб беларускіх школах у рэзалюцыю зьезду ня было дапушчана. Але самы факт выступленьня прадстаўнікоў гмінных рад Віленшчыны з дамаганьнем беларускае школы—вельмі паказальны!

Уваскрасеньне палітыкі Ст. Грабскага.

Пасьля доўгае і дружнае барацьбы ўсіх нацыянальных меншасьцяў Польшчы з проціканстытуцыйным цыркулярам Ст. Грабскага, які трэбаваў, каб у няпольскіх прыватных гімназіях навука агульнае гісторыі і геаграфіі адбывалася ў польскай мове, — цыркуляр гэны ў пачатку мінулае восені быў узяты ўрадам назад.

Аднак, дух Грабскага перажыў міністэрства эндэцкага ідэалёга, і „лібэральны" ўрад марш. Пілсудскага тасуе прыёмы Грабскага—дый у яшчэ пагоршаным відзе!—да беларускіх школьнікаў, б'ючы „меншасьці" ня ўсе агулам, а паасобку.

Гэтак, віленскае кураторыум надовячы прыслала ў Віленскую Беларускую Гімназію загад, каб у ёй **зараз-жа (—у канцы школьнага году!) увялі ў малодшых клясах, пачынаючы ад першай, навучаньне польскае гісторыі—папольску!**

Калі прыняць пад увагу, што вучні першае клясы зусім ня ведаюць польскае мовы і толькі пачынаюць знаёміцца з ёю, дык трэбаваньне кураторыуму, каб дзяцей вучылі новага прадмету ў гэтай незнаёмнай мове, прадстаўляе ня толькі праяву нацыянальнага гвалту, але і самы дзікі абсурд з пэдагагічнага пункту гледжаньня.

На апошнім пункце гледжаньня станула Пэдагагічная Рада Гімназіі і горача запратэставала як проці антыпэдагагічнага прымушаньня вясьці вучэньне ў няведамай для вучняў мове, так і проці недапусьцімага ламаньня школьнае праграмы ў канцы школьнага году.

Трэба думаць, што Гімназія ні ў якім выпадку ня згодзіцца дапусьціць такое калечаньне дзяцей і забіваньне ім галоў, бо пры ўвядзеньні вымаганага кураторыумам новага прадмету лічба гадзін у тыдзень непамерна мусіла-б быць павялічана з яўнай шкодай для ўсіх выкладаных у Гімназіі прадметаў.

Дэкляарацыя літоўскага прэм'ера.

Як ужо ведама нашым чытачом з кароткіх тэлеграфных паведамленьняў, літоўскі прэм'ер Вальдэмарас прачытаў у Літоўскім Сойме ўрадавую дэкляарацыю, у якой перадусім заявіў, што палітыка Літвы ня будзе — ані русафільская (асабліва, ці выключна прыязная да СССР), ані немцафільская, ані англафільская, ані якая іншая. Палітыка Літвы можа быць толькі — літоўскай.

Літоўская палітыка ўся зьмяшчаецца ў гэткай праграме:

„Незалежная Літва з сталіцай Вільняй, і—ніякіх асабліва блізкіх палітычных ці гаспадарчых саюзаў з вялікімі суседнімі дзяржавамі".

„Падчырківаю,—казаў прэм'ер,—што мы шукаем мірнага спосабу дзеля зьдзейсьненьня гэтай праграмы". Літва павінна стацца нэйтральнай дзяржавай (гэта значыць — бяз арміі), але, зразумела, яе нэйтральнасьць (—яе граніцы) павінна быць прызнана і загарантавана ў міжнародавым парадку (ўмовай, падпісанай усімі вялікімі дзяржавамі). Праводзячы гэты новы ў усходняй Эўропе прынцып у жыцьцё, трэба было-б пашырыць яго тасаваньне і на іншыя балтыцкія дзяржавы, прызнаўшы нэйтральнымі таксама Латвію, Фінляндыю, Эстонію. Можна задаць пытаньне: як-жа гэтая нэйтральнасьць Літвы адаб'ецца на інтарэсах яе суседзяў: расейцаў і палякоў? Абодва толькі-б скарысталі на гэтым. — Расейскі фронт з боку балтыцкіх дзяржаў скараціўся б на 1500 кілямэтраў. — Небясьпека вайны спынілася б адразу (???).

Палякі павінны былі-б (за гэтую „нэйтральнасьць"!) вярнуць Літве (разброенай...) Віленшчыну і Горадзеншчыну—без усялякай заплаты (—Клайпэдай, ці чым іншым). Аднак-жа палякі на гэтым ня страцілі б нічога.—Бо-ж гэтыя два месты патрэбны палякам галоўным чынам, як стратэгічныя пункты (ваенныя падставы). Але пры нэйтралізацыі Літвы ды пры паважных міжнародавых гарантыях ніякай небясьпекі для Польшчы больш не істнавала-б...

Матэрыяльна Польшча толькі б выйграла на гэтым, бо магла-б тады значна зьменшыць выдаткі на абарону краю, якія руйнуюць цяпер яе дзяржаўны скарб...

Апрача таго ўсе іншыя прычыны змушаюць аддаць Літве Віленшчыну і Горадзеншчыну.– Гістарычна гэтыя абшары — ад вякоў літоўскія (?!). Тое-ж трэба сцьвярдзіць і аб сучасным нацыянальным характары і складзе насяленьня гэтых краёў. (Ну, ну! — Асабліва—Горадзеншчына, дзе — пры чыста беларускім складзе насяленьня літвіноў, здаецца, нямашака навет на лякарства!). Што-б ні казалі палякі, яны заўсёды будуць меншасьцю у гэтых краёх (як і літвіны!).

„Мы прызнаем, што палякі ўсё-ж маюць, апрача стратэгічных (ваенных), так-жа і паважныя гаспадарчыя і нацыянальныя інтарэсы ў Віленшчыне, аднак-жа—меншыя, чым, напрыклад, швэды ў Фінляндыі. Гэтыя інтарэсы можна забясьпечыць зусім добра іншымі спосабамі"...

Канчаючы сваю прамову, прэм'ер выразіў надзею, што—„прыдзе калісьці час, калі над старым замчышчам Гедыміна ўзаўецца дзяржаўны сьцяг незалежнай Літвы"... „Гатуючыся да гэтай хвіліны, мы не прапусьцім ніводнай магчымасьці, ня выкарыстаўшы яе дзеля гэтай канчатковай мэты"... А... — **„дзеля таго мы ня будзем ухіляцца ад перагавораў з Польшчай, паскольку гэтыя перагаворы будуць датыкацца рэалізацыі гэтай нашай праграмы".**

Вось з гэтага канца і трэба было-б пачаць красамоўнаму літоўскаму прэм'еру, калі б ён папросту хацеў раскрыць тое, што сталася ў Літве—у выніку англа-фашыстаўскага перавароту 17 сьнежня...

Калі ёсьць што яснага і рэальнага ў-ва ўсей наіўна-рамантычнай прамове літоўскага прафэсара-прэм'ера, дык толькі **згода літоўскага ўраду спыніць „стан сталай вайны"** і распачаць з польскім урадам **перагаворы,** без папярэдняга „звароту Літве яе сталіцы Вільні", як трэбавала дагэтуль — „палітыка Вялікай Літвы"...

Заўсёды добра паінфармаваная нямецкая прэса піша ўжо аб „польска-літоўскім блёку", які ўжо падрыхтаваны „англійска-польскім паразуменьнем"...

У Сойме.

Справа абароны дзяржаўных граніцаў у вайсковай камісіі.

Эндэкі падалі ў Сойм інтэрпэляцыю ў справе ваеннай небясьпекі, пагражаючай Польшчы з боку Нямеччыны; інтэрпэляцыя ў вайсковай камісіі выклікала цікаўную дыскусію.

Інтэрпэляцыя дае агляд нямецкай акцыі за апошні час, калі былі выкрыты набудаваныя на ўсходняй граніцы Нямеччыны крэпасьці, скіраваныя проці Польшчы, а ў канцы пытаецца, што зрабіў урад, каб паралізаваць гэты нямецкі плян—новага падзелу Польшчы?

Дакладчык, зрэфэраваўшы справу, выразіў жаль, што ў камісіі на гэткай важнай справе няма прадстаўніка ўраду. Далей ён сцьвярдзіў, што ў Нямеччыне ніхто ўжо ня ўкрывае плянаў проці Польшчы. — Усе партыі і найвышэйшыя ўрадоўцы падзяляюць думку ведамай дэкляарацыі б. канцлера Вірта, што „аступленьне Польшчы Памор'я—гэта недарэчнасьць". У канцы дакладчык закідаў ураду, што яго разьведка абсалютна нічога ня ведала, што рабілася ды будавалася на граніцы ў заходняга суседа. Аб пабудаваных крэпасьцях саюзьнікі даведаліся толькі з рэвэляцыяў англійскага генарала Моргана і Міжсаюзнай Кантрольнай Камісіі.

ваенным бюджэце Польшчы няма ніводнаэша на ўзмацненьне заходняй граніцы.

У распачатай дыскусіі пэпэсы дамагаліся... тайнасьці нарадаў, „сяляне"—пілсудчыкі бачылі ў інтэрпэляцыі перадусім — „эндэцкую інтрыгу", маючую мэтай падарваць даверые да ваеннага міністра Пілсудскага. Вызваленьне так сама трэбавала тайнасьці дыскусіі, даводзячы, што інакш... магла-б раскрыцца перадусімі ваенная адсталасьць Польшчы — ў параўнаньні з яе суседзямі. Дзеля таго ня трэба выносіць справу на поўны Сойм, але вырашыць у камісіях—вайсковай і заграніч. спраў на злучаным паседжаньні. Хадэкі, эндэкі, дубадэкі і пястоўцы востра крытыкавалі ўрад за тое, што ён маўчыць, нічога ня робіць, ці, можа, укрывае сваю дзеяльнасьць ад Сойму—ў такі важны, пераломны, гістарычны мамэнт... у такія мамэнты ўрад, Сойм і грамадзянства павінны быць аб'яднаны. „Хрысьціянскія дубадэкі" аказаліся найбольш ваяўнічымі: яны дамагаліся, каб урад распачаў так сама, як Нямеччына, будаваньне крэпасьцяў на польскім бэку граніцы, каб пачаў—па прыкладу Францыі—„ваенную арганізацыю ўсяго народу", каб заявіў з парляманцкай трыбуны, што „імкненьні Нямеччыны да падзелу Польшчы—паводле пляну... Фрыдрыха II—сустрэнуць адпор"... Асабліва даставалася ўраду ад эндэкаў—за яго маўчаньне ды яго адсутнасьць на паседжаньні. Усе гэта — казалі яны—зробіць найгоршае ўражаньне ў краі і заграніцай, выклікаючы думку, быццам „урад навет у справе абароны дзяржаўных граніцаў ня можа паразумецца з прадстаўнікамі народу".

Справа зьменаў у Выбарным Законе.

24 лютага пачалася дыскусія ў канстытуцыйнай камісіі Сойму над цэлым радам праектаў-зьменаў у Выбарным Законе, прапанаваных усімі бяз вынятку клюбамі Хіена-Пяста.

Усе праекты значна зьмяншаюць лічбу паслоў і сэнатараў (эндэцкі — аж напалову), ўводзяць зьмены выбарных акругоў, значна абмяжоўваюць народнае прадстаўніцтва на „ўсходніх Крэсах"—на карысьць цэнтральнай і заходняй Польшчы. Некаторыя праекты касуюць прапорцыянальнае галасаваньне на сьпіскам, уводзячы галасаваньне на асобы—ў адно-мандатных акругох. Усе гэтыя зьмены выразна скіраваны проці прадстаўніцтва работнікаў і сялян.

Дакладчык эндэк Гломбінскі заявіў, што „Сойм у дзяржаве, якая толькі-што здабыла незалежнасьць, павінен складацца з паслоў, якія разумеюць павагу гістарычнай хвіліны дый перадусім будуць старацца аб будаваньні дзяржавы".

Прадстаўнікі лявіцы пратэставалі наагул проці ўсялякага перагляду Выбарнага Закону, як і проці таго, што ўсе прадстаўленыя польскай рэакцыяй праекты яўна пярэчаць Канстытуцыі; пазываліся, паміж іншым, і на тое, што і ўрад ня прымае ўчасьця ў гэтым пераглядзе, бо яго прадстаўнік сам заявіў, што прысутны толькі, як наглядчык—дзеля інфармацыі.

Аднак-жа правіца мела рашучую большасьць у камісіі, дык усе пратэсты лявіцы прапалі дарма.— Камісія пастанавіла на першым паседжаньні працу над праектамі прадаўжаць.

Пасьля першага паседжаньня Камісіі з лона ўраду пайшлі весткі, што ўрад ня толькі зацікавіўся працай камісіі над справай зьмены Выбарнага Закону, але і сам сьпешна пачаў апрацоўваць свой ўласны праект, канкуруючы з аўтарамі з соймавай правіцы. Як пішуць газэты, урад даручыў апрацаваць адпаведны праект урадоўцу мін. унутран. спраў п. Гжыбоўскаму, уславіўшамуся ўжо на ўвесь сьвет праектам „прэсавага закону". Урад быццам ня зьбіраецца ад сябе падаваць свой праект у камісію, але мае—падкінуць яго праз які-небудзь з урадавых клюбаў, (Вызваленьне, Сялянск. Зьвязок, ці „Клюб Працы), як гэта ўжо раз было зроблена з „малым самаўрадавым законам".

У апошнія дні зусім неспадзявана „Глос Правды", які страшэнна лаяў дагэтуль эндэцкія праекты, раптам—заявіў, што ўрад можа і сам заняцца гэтай справай, але трэбуе на гэта—„неабмяжаваных паўнамоцтваў"...

У справе самаўрадавых законаў.

У польскай прэсе пачалася гарачая кампанія ў справе падрыхтаваньня самаўрадавых законаў.

Цэнтральным пытаньнем для „крэсавага" насяленьня (няпольскага) ў справе самаўрадаў зьяўляецца: ці пры выбарах у самаўрады будзе дзеяць дэмакратычны выбарны закон, які даў-бы роўныя правы ўсім грамадзянам—бяз розьніцы нацыянальнасьці, ці — наадварот — выбарныя правы мясцовага няпольскага насяленьня будуць так або інакш абмяжованы — на карысьць польскага?

Як ведама, слаўныя „кернікаўскія" самаўрадавыя законапраекты" давалі паляку на „крэсах" на 3—4 дадатковыя галасы. Гэткім чынам вымаганая Канстытуцыяй роўнасьць усіх грамадзян Польшчы ажыцьцяўлялася ў самаўрадах так, што, як пісалі тады беларускія газэты, — „кожны паляк на „крэсах" быў варты роўна пяцём беларусам"... Як чутно, той законапраект, які быццам прыняты ў другім чытаньні адміністрацыйнай камісіі Сойму, адкінуў гэткую хіена-пястоўскую „роўнасьць" для „крэсаў". Але правіца дамагаецца адбудаваньня гэтай „кернікавай роўнасьці".

Што думае і што мае рабіць у справе самаўрадавых законаў урад, мы дакладна з прамовы віцэ-прэм. Бартля не даведаліся. Ён казаў толькі аб хутчэйшым увядзеньні ў жыцьцё самаўрадаў у Польшчы ды аб нейкай „модэрнізацыі" (паднаўленьні) іствуючай у Кангрэсоўцы так-званай „ордынацыі Марачэўскага". Але галоўнае для нас пытаньне: у чым будзе зьмяшчацца гэтае „падпаўленьне" іствуючай ордынацыі, ды ці ўтрымаецца ў ёй роўнасьць выбарнага права для „крэсаў", — дагэтуль астаецца пытаньнем.

Праўда, урадавы „Глос Правды" піша, што ні аб якой „плюральнасьці" (дадатковых галасох) для палякоў ці для цэнзавікоў ня можа быць мовы; але мы ніколі ня ведаем, ці тое, што пішацца ў гэтым „афіцыёзе" выражае думку ўраду, ці не.

Бароначы перадусім роўнасьць выбарнага права ў самаўрадзе, ня трэба забываць, што закон павінен гарантаваць самаўрадавым установам запраўдную самастойнасьць жыцьця і працы. Ну, у гэтай галіне, дык здаецца, ужо няма ніякай розьніцы між хіена-пястоўскімі праектамі і паглядамі ўрадавых колаў: „самаўрады — натуральнае дапаўненьне і прадаўжэньне дзяржаўнай адміністрацыі", — сказаў мін. Бартэль.

„Самаўрад... пана стараеты" — так называлі ў 1923 г. кернікавыя законапраекты, якія і цяпер соймавая камісія ўзяла за падставу для свайго праекту.

Хто чытае нашу газэту і не прысылае падпіскі, той ня спрые разьвіцьцю роднай беларускай прэсы.

БРАТЫ! Прысылайце падпісную плату, а хто задоўжыўся, выраўняйце свой доўг.

Урад — аб зямельнай рэформе.

(Прамова мін. Станевіча ў Сойме).

У часе разгляду ў Сойме бюджэту міністэрства зямельных рэформаў мін. Станевіч сказаў прамову, у якой высьвятліў, што зроблена, што робіцца і што мае быць зроблена гэтым міністэрствам у справе правядзеньня ў жыцьцё закону 1925 г. „аб парцэляцыі і асадніцтве". Падаем у скарочаньні галоўны зьмест прамовы.

Напачатку міністар слушна сьцьвярдзіў існаваньне таго зачараванага кола, у якім апынулася гаспадарчае разьвіцьцё Польшчы. Вёска —пералюднена ды пералюдняецца ўсё больш, бо лішкаў вясковага насяленьня ня ўсасывае ў сябе места, якое ня толькі не разьвіваецца, але наадварот—занепадае, выкідаючы з сябе ўсё больш безработных на вёску... Мястовая прамысловасьць ня можа разьвівацца перадусім дзеля таго, што ня мае шырокага ўнутранага рынку, якім у Польшчы можа быць толькі сялянства. А гэтае сялянства ня можа купляць вырабаў прамысловасьці, бо згалела ды ўсё больш галее—перадусім з прычыны нястачы зямлі. „Маем на ўсходзе больш за мільён гаспадарак зусім някультурных, бескарысных для гаспадарчага жыцьця краю, ня маючых ніякай набыўчай сілы".

Мы ведаем, што гэткіх гаспадарак у Польшчы наагул—больш за 2 мільёны.

З другога боку „гісторыя сьведчыць, што там, дзе занепадалі месты, занепадалі ў выніку гэтага і дробныя сялянскія гаспадаркі".

Так слушна казаў міністар...

„Ня можна гутарыць аб падняцьці гаспадаркі дробнага земляроба, пакулі аграрны лад нашай вёскі пабудаваны на шнурох". Дык—паводле п. міністра, які толькі што казаў перадусім—аб недахваце зямлі, — начало ўсей задачы падняцьця сялянскай гаспадаркі „высоўваецца — справа комасацыі" (перарэзка шнуроў на хутары)..

Але-ж ясна, што рабіць з такіх сялянскіх шнуроў у паўмарга „хутар", такі-ж самы „карлаваты", галодны для гаспадара яго дый бескарысны для дзяржавы,—ня мае ніякага сэнсу. Дык тут п. міністар і мае быццам выкарыстаць зямельны запас Краю—дзеля прырэзкі, каб зрабіць з гэтых малазямельных гаспадарак—сільныя, здольныя да самастойнага існаваньня і прадукцыі хутары.

Міністар казаў, што зямельны запас Польшчы трэба перадусім выкарыстаць на гэтую мэту, не марнуючы яго (як гэта ідзе дагэтуль—шляхам „дзікай парцэляцыі"),— бо інакш гэты запас папросту прападзе дарма, а асноўная задача гаспадарчага аздараўленьня вёскі і места ў Польшчы—ня будзе вырашана. Чым гэта пагражае Польшчы, ясна само сабой...,

„Комасацыйную сваю праграму хачу зьвязаць з акцыяй парцэляцыйнай, асадніцкай і эміграцыйнай".

Міністар заявіў, што—будзе і далей садзіць чужакоў-асаднікаў на шыю беларускага хлебароба, адбіраючы ў яго с-пад носу для чужынцаў зямлю... Але гэтую горкую праўду п. міністар, каб ня выклікаць на мясцох натуральнага абурэньня, — абкручывае featureрознымі пекнымі паперкамі. — „На заходзе, як і на ўсходзе, мы маем яшчэ шмат зямлі, якая можа служыць для асадніцтва. Але асадніцтва ня можа адбывацца з крыўдай для мясцовага насяленьня, зямельныя патрэбы якога трэба перадусім здаволіць. Толькі пасьля ўпарадкаваньня зямельных адносінаў на мясцох, калі яшчэ астанецца запас зямлі ці калі будуць на мясцох здабыты новыя абшары выгаднай зямлі (з няўжыткаў, балотаў і інш.),—тады можна будзе далей вясьці асадніцкую акцыю". Дык вось—надалей асадніцкую акцыю дзяржаўная ўлада больш сама вясьці ня будзе, а пакідае яе — „прыватнаму пачыну".

Што выйдзе на дзеле з гэтай „прыватнай асадніцкай акцыі" абшарнікаў на нашых „крэсах", можна лёгка сабе прадставіць. Чым яна будзе розьніцца ад шалеючай дагэтуль па ўсей Польшчы „дзікай парцэляцыі"—так сама сэкрэт п. міністра.

П. Міністар абяцаў урэшце надалей — „акружыць дзяржаўнай апекай і ўмацоўваць быт ужо існуючага асадніцтва, — ясна-ж, і таго, якое мае быць далей творана на „крэсах", шляхам новага — „прыватнага (абшарніцкага) пачыну".

„Ня будучы запаленым прыхільнікам асадніцтва", п. міністар найбольш клапоціцца якраз аб лёс гэтага „няшчаснага нашага асадніка"..—Гэтага „беднага нашага асадніка" кіравалі часта-густа ня туды, дзе быў запраўды запас зямлі, але акурат туды, дзе цеснага мясцовай люднасьці была найвялікшая". Гэта, мімаходам кажучы, — вельмі цэннае афіцыяльнае прызнаньне, ясна і выразна сьцьвярджаючае запраўдныя мэты і мэтады польскага асадніцтва на няпольскіх „Крэсах". — Асаднікаў часта-густа садзілі ня там, дзе яны маглі б мірна працаваць (калі-б такія здарыліся), але там, дзе яны, навет не жадаючы гэтага, мусілі выклікаць найвялікшае абурэньне, ненавісьць і „панаваць" над мясцовым насяленьнем—пры апецы і падтрыманьні з боку ўсіх магутных рэсурсаў польскай дзяржаўнай улады—грашовых, вайсковых і паліцэйскіх...

Вось гэта, паводле добрага сэрца п. міністра, — „першае няшчасьце... польскага асадніка"...

„Другое няшчасьце асадніка" на „крэсах"—у тым, што ён—чужы для мясцовага насяленьня... „Асадніцкія элемэнты былі можа й вельмі заслужаныя (з войска і т. п.), але як ні як—чужацкія. — Асаднікаў з мясцовага насяленьня не рабілі"... Вось гэтую „прорву" п. міністар і „жадае засыпаць раз назаўсёды".

Як-жа ён мае гэта зрабіць? — А вельмі проста: „... надзяліць зямлёй у першую чаргу тых... асаднікаў, якія пайшлі ў польскае войска ў 1918 — 1920 г. г., якія ваявалі ў польскай арміі, але зямлі дагэтуль не атрымалі"...

Каб гэтыя новыя асаднікі мелі быць выключна з мясцовага беларускага насяленьня, міністар не сказаў (цытуем паводле абшарніцкай „Варшавянкі"). Дык—каго ён „акружыць асаблівай апекай дзяржаўнай улады", можна толькі дагадывацца.

У Польшчы.

Узрост безрабоцьця ў Польшчы.

Паводле афіцыяльных даных, за два тыдні ад 5-га да 19 га лютага — лічба безработных у Польшчы ўзрасла на 4.600 зьлішкам асоб.

„Самаўрадавая Рада".

Урад апрацоўвае дэкрэт ад аб стварэньні „Самаўрадавай Рады". У хуткім часе мае быць апублікаваны сьпісак сяброў Рады. Побач з

Ляо-Дзэ.

У ДАЛІНЕ ГАНГА.

Чацьвертыя суткі пёрся пасьпешна на ўсход цягнік з паўночнай Афганскай граніцы Брытанскай Індыі ў кірунку Калькутты. Даўно пакінуў за сабою гэты сталёвы зьмей гарысты Кашмір, пранёсся, сяпучы і грукочучы праз даліны Пэнджаба, мінуў правінцыю Рад-Путана, зрабіў у шалёным бегу тры тысячы кілямэтраў, а канца дарогі ніяк ня відаць. Цяпер у прыкрытых густымі шторкамі вокнах вагонаў блішчыць шырокаводны сьвяты Ганг. Ён то ўцячэ ў бок ад чыгункі, то зноў кінецца яра к падножжу крутой насыпі і, ударыўшы чыстаю хваляй аб жоўты пясок, у злосьці бяссільнай коціцца час якісь упоплечкі з ёю.

Нудна ў вагонах. Доўгая дарога ўжо змучыла ўсіх пасажыраў. Іх вока ня вабіць сваею красаю прыгожая і густанаселенная даліна Ганга, ня лашчуць яго прыгожыя палеткі Бэнгаліі. Хаваючыся як найдалей ад гарачых прасмаў паўднёвага сонца, гэтыя здаровыя рослыя мужчыны, апранутыя ў белую вопратку брытанскіх каляніяльных войск, самі ня ведаюць, як ім збыць нудны час. А час гэты, быццам сьмяючыся з іхняй нуды, ідзе так паволі, так аднастайна. Каратаючы яго, іншыя расьцягнуліся на лаўках і сьпяць, некатарыя, курачы на ангельскі фасон невялічкія люлькі, гуляюць у карты, у якімсьці вагоне адзываецца клярнэт і флейта, яшчэ дзесьці чуваць старая бэнгальская песьня.

Прэцца цягнік усё ўпярод і ўпярод, пасьпяшаючы даставіць што-найскарэй у Калькутту гэты транспорт войска. Пройдзе некалькі тыдняў, і гэтыя рослыя бэнгальцы ўзойдуць на бераг Кітайскай зямлі, каб можа ўжо ніколі не вярнуцца адтуль у родныя даліны мнагаводнага Ганга.

У вакне аднаго з афіцэрскіх вагонаў, насунуўшы нізка — дзеля гарачыні—на лоб коркавую вялікую каску, стаяў смуглы капітан.

Доўга і пільна прыглядаўся ён да палёў пладароднай Бэнгаліі. Пападаўшыяся на кожным кілямэтры каля чыгуначнай насыпі абарваныя худыя фігуры тубылцаў з неякім жахам касіліся на гэты перапоўнены ваякамі цягнік і праводзілі яго сваім пужлівым поглядам.

На твару капітана выступіў пот; некалькі капель яго скацілася навет на белую, як сьнег, яго кашулю; але ён і ня думаў выцірацца.

Думкі адна за аднэй праходзілі праз яго галаву пры відзе гэтага людзкага мурашніку на зямлі,[1])—думкі нудныя невясёлыя...

— „Аб чым задумаўся, калега"? — спытаўся капітана, падышоўшы да яго, другі афіцэр.

Капітан пасьпешна агляпуўся.

— „Так неяк мне сумна" — адказаў ён яму, ціха ўздыхнуўшы, і, дастаўшы з кішані чыстую, як сьнег, хустачку, пачаў выціраць ею пот з свайго твару.

— „І ахвота вам, капітане, так пячыся на сонцы"?

— „А ці-ж нам, бэнгальцам, да яго прывыкаць"?—адказаў той, уздыхнуўшы ізноў.— „У гэтай даліне я, як і большасьць гэтых салдатаў, ды здаецца і вы, калега, — радзіўся; мне люба гэта даліна і гэтае пякучае сонца"...

Афіцэр хацеў, відаць, сказаць свайму калезе яшчэ нешта, але той штурхануў яго ў бок і, даўшы вачыма знак маўчаньня, пасьпешна, быццам баючыся, каб штось не раздавіла, пастараніўся ў бок.

Асьцярожнасьць была ня лішняя: да іх ішоў малады, курносы, толькі што выйшаўшы з ваеннай школы, англіец. Ня гледзячы на свой малады век і адзнакі першага афіцэрскага чыну на плячох, гэты англічанін, высока задзёршы галаву, не аддаючы ім чэсьці, горда прайшоў каля іх.

— „Фу, брыда"... прагаварыў ціха, паглядаючы яму ў сьлед, афіцэр. — „Не пасьпеў малака з вусен яшчэ абцёрці, а ужо задзірае ўверх нос".

Дагадаўся можа малады англіец, што бэнгалец ня добра аб ім адазваўся, ці яму проста захацелася паказаць сваю кадэцкую ўласьць над капітанамі, Бэнгальцамі — але ён раптам павярнуўся назад і падышоў да афіцэраў.

— „Сэр капітан Асока", — зьвярнуўся ён заносчыва да першага афіцэра: „у вашых салдатаў брудныя стрэльбы, неадкладаючы трэба іх вычысьціць а на будучыню гэта паўтарацца не павінна. Тое-ж самае і ў вашых салдатаў, сэр капітан Магабрата, будзьце ласкавы зрабіць парадак і не забывацца, што вы афіцэры яго вялічаства імпэратара Індыі і каразя Вялікабрытаніі".[1])

І, не чакаючы адказу афіцэраў, англічанін павярнуўся і пайшоў ізноў сваею дарогай.

Загад быў дадзены; салдаты пакорна разабралі і злажылі чыстыя, як люстра, свае стрэльбы, а капітан Асока, яшчэ больш хмурны і задуманы, чым перш, ізноў стаяў ля вакна. Дзень цяпер падыходзіў к канцу, і гарачыня паволі пачынала спадаць. Калі перш абапал чыгункі пападаліся толькі паадзінокія людзі, то цяпер нівы і дарогі літэральна кішэлі людзьмі. Худыя і абдзёртыя, высокія смуглыя фігуры з капачкамі і рыдлёўкамі ў руках ускапывалі свае палёткі; каля іх поўзалі, нявраз зусім голыя, дзеці. Гэтыя-ж самыя абдзёртыя і чуць жывыя людзі, сагнутыя цяжкімі ношамі, пападаліся на кожнай дарозе і сьцежцы.

— „Куды мы едзем"? — думаў сабе капітан Асока. „Што зрабілі індусам благога кітайцы"?

І ён мімаволі пачаў успамінаць чамусьці гісторыю Індыі. Невясёлыя былі яе старонкі. Вялікі і багаты край гэты быў вечнай пакусай розным авантурыстам і ахвотнікам лёгкай нажывы. І хто толькі не сягаў сваей крывавай рукой па скарбы яго. Тут былі і грэкі і афганцы, манголы і Тамерлан; пазьней на іх месца прыйшлі эўрапэйцы: і гішпанцы, і галяндцы, і французы. Усіх іх зьмянілі пазьней англійцы.

Што далі гэтыя розныя прыблуды Індыі?... — Цяжкія падаткі і паняверку індусаў.—Чатырыста мільёнаў людзей, усе касты і роды старай Індыі, сталіся судрамі [1]) і парыямі [1]) англійцаў.

Чым стаўся напрыклад ён, сын сялянскай касты?... Што даў яму гэты чын капітана арміі Індыйскай імпэрыі, якога ён так доўга і ўпарта дабіваўся, не жалеючы ані стараньня, ані здароўя?...

Пад сваім начальствам ён мае сотні дзьве паслушных яго загаду такіх самых, як ён, бэнгальцаў, якіх невядома за што ён павінен вясьці ў бой, каб душыць людзей, якія яму не зрабілі нічога благога, якія толькі хочуць самі быць над сабою панамі, жыць так, як ім падабаецца.

І за гэта за ўсё кожны першы лепшы англійскі смаркач у пагонах афіцэра мае права камандаваць ім, як пешкай, рабіць выгавары, на якія ён можа не заслужываў, і браць пэнсію ў дзесяць разоў большую, чым ён, бэнгалец...

І чые, чые грошы, чыя скрысталізаваная і застыўшая ў гэтых грашах праца ідзе так шчодра ў кішані гэтых прыблудаў? Да Індыі Англія не дакладывае ані грошыка — гэта правіла караля Брытаніі. Навет голад, які так часта госьціць у гэтым вялікім краі, ня прымусіў ніразу ўздрыгнуцца ад жаласьці сэрца ангельца; моўчкі праходзілі яны

[1]) На 1 кілям. у Бэнгаліі прыходзіцца больш за 200 душ. Усяго ў Бэнгаліі больш за 100 мільёнаў жыхароў.

[1]) У Брытанскай Індыі афіцэр англічанін мае права загадываць навет вышэйшым афіцэрскім чынам з індусаў але індус англічанінам камандаваць ня сьмее.

[1]) Па брамінскаму закону Ману ўсе людзі дзеляцца на пяць каст: першая — браміны, духоўныя — ім служаць усе касты, далей ішлі кшатрыі, на якіх працавалі сяляне, а за гэтымі ідуць судры і парыі — нямеўшыя ніякіх правоў, вечна пагарджаныя і вечныя рабы.

прадстаўнікамі ўраду, у Раду ўвойдуць прадстаўнікі мясцовых і вясковых самаўрадаў. Рада мае займацца рознымі пытаньнямі мясцовай самаўрадавай гаспадаркі: падаткамі, будаўніцтвам, санітарным і інш.

Усяго здаецца, „надэкрэтавана" каля дзесятка рознага роду Радаў. Ці ня маюць яны — у выпадку патрэбы—заступіць выбарны парлямант у Польшчы, ставаючы яго больш пакорны „эрзац"?!

Канфіскацыя адозвы польскай „Лігі Абароны Правоў Чалавека".

Яшчэ ня так даўно польская „Ліга Абароны Правоў Чалавека" спаўняла вельмі „патрыятычную", але па сутнасьці—мала ўдзячную ролю абаронцы гонару, амбіцыі і славы польскіх вастрогаў — ад „няслушных закідаў" з боку сваей сястры, ці маткі — француская „Ліга абароны правоў чалавека". Здаецца, усе „сьвяціла" польскае лявіцы, на чале з самім старшынёй соймавай вастрожнай камісіі п. Тугуттам, падпісвалі тады гарачыя пратэсты проці шырэньня ў Эўропе „злоснай і агіднай брахні" аб польскіх вастрогах.

Пасьля таго прайшло шмат часу,—адбыўся ў Польшчы „маёвы пераварот", які даў Польшчы „панаваньне дэмакратыі" і ведама-ж, — усе правы „чалавеку і грамадзяніну" ў Польшчы. І вось, дзіўная рэч: гэтая самая „Польская Ліга Абароны Правоў Чалавека" выступіла ізноў з нейкай адозвай дый ізноў—у справе палітычных вязьняў і турмаў у Польшчы. Пад новай адозвай стаяць, здаецца, подпісы тых-жа старых сяброў — пратэстантаў проці „зьвягі" на польскае „вензеніцтва". Ізноў—на чале сьпісу—п. Тугутт, пасьля—пас. Сьмяроскі; тут і—сэнатары-пэпээсы: — Ліманоўскі, 70-летні патрыярх ППС, ня менш слаўны, як сам Пілсудскі; і Познэр; далей ідзе цэлы рад ведамых адвакатаў, пісьменьнікаў і інш.

Нажаль, толькі вось ні можна ніяк даведацца шырокай публіцы, аб чым кажа гэтая адозва, каго, ці што ды ад каго бароніць цяпер гэтыя абаронцы правоў чалавека і грамадзяніна ў Польшчы: ці добрую славу польскіх вастрогаў, адміністрацыі і паліцыі, ці—наадварот — правоў чалавека, грамадзяніна і... палітычнага вязьня ў Польшчы. Ня можна даведацца затым, што адозва Польскай Лігі Абароны Правоў Чалавека — сканфіскавана ўрадам.

Прыезд польскага пасла з Масквы.

У пачатку сакавіка мае прыехаць у Варшаву польскі пасол пры Радавым Урадзе пан Патэк. Прыяжджае ён у справе дадатковых інструкцыяў дзеля польска-расейскіх перагавораў аб заключэньні таргоўага дагавору.

„Глос Правды" ўжо не афіцыёз?!

Прэзыдыум Рады Міністраў афіцыяльна заяўляе, што „Глос Правды" не зьяўляецца зусім выразіцелем пагляддаў урадавых колаў, дый што за яго заявы ўрад ніякай адказнасьці на сябе не бярэ.

Да гэтага „Дзен. Віл." ад сябе дадае: „Аднак-жа грошы на „Глос Правды" дае ўрад"!..

Заграніцай.

Радавы адказ англійскаму ўраду.

Радавы ўрад выслаў адказ на англійскую ноту. Адказ напісаны ня менш рэзка, як і англійская нота, і з свайго боку вінаваціць англійскі ўрад у цэлым радзе нарушэньняў леяльнасьці адносна да СССР. Сьцьвярджаючы, што ў англійскіх абвінаваньнях былі толькі агульныя закіды, але ніводнага канкрэтнага факту ня было паказана, радавая нота заяўляе, што найбольш дзіўны з англійскіх закідаў, — гэта закід дапусканьня ўрадам СССР варожых да Англіі выступленьняў радавае прэсы. Перадусім, — між СССР і Англіяй няма пакуль-што ніякай „канвэнцыі, абмяжоўваючай у абодвух краёх свабоду слова і прэсы". Але англійскі ўрад сам менш, чым хто іншы, мае права рабіць гэткія закіды, — бо якраз сябры англійскага габінэту, як Чэрчыль, Біркенхэд, Хур, Эванс і інш., дазвалялі сабе такія выступленьні проці СССР і яго ўраду, якіх пэўна не дапусьцілі-б ні толькі афіцыяльныя, але і безадказныя палітыкі Радаў. Прычына ненармальнасьці адносінаў між СССР і Англіяй—у тым, што англійскі ўрад дазваляе сабе сыстэматычна нарушаць — у адносінах да радавага ўраду—усе агульна прынятыя ў цывілізаваным сьвеце міжнародавыя нормы, а навет формы звычайнай прыязьнасці. А калі ён робіць у сваіх нотах якія галаслоўныя закіды, дык заўсёды адмаўляе дамаганьням з боку ўраду СССР — разглядзець гэтыя абвінаваньні ці рэчова ўрэгуляваць пратэнзіі. А да гэтага яшчэ дазваляе сабе тасаваць па адрасу СССР нейкі дзіўны „пагражаючы" тон, мяшаючы пры гэтым канстытуцыйны радавы ўрад з палітычнымі партыямі ці міжнародавымі арганізацыямі, працуючымі ці маючымі сядзібу ў СССР.

Далей нота закідае англійскаму ўраду ня толькі адмову ад устаноўленьня нармальных адносінаў з Радамі, але яшчэ і — падрыхтаваньне — разам з рознымі былымі царскімі сановьнікамі, якіх шмат згуртавалася ў Лёндане,—новага аружнага паходу проці СССР, што не дае магчымасьці радаваму грамадзянству з свайго боку забыцца аб той ролі, якую Англія адыграла ў часе пяршага паходу на СССР (у часе барацьбы з контр-рэвалюцыяй).

Пагрозы поўнага сарваньня адносінаў ніколі ў СССР перастрашыць ня могуць. Калі сучасны англійскі ўрад лічыць гэтае сарваньне карысным для Англіі, дык хай робіць гэта, але і прыме на сябе ўсю адказнасьць за вынікі...

У канцы Радавы ўрад заяўляе, што у кожную хвіліну гатовы выясьніць усе ўзаемныя непаразуменьні і наладзіць нармальныя адносіны паміж абодвума краямі.

Становішча нямецкае прэсы.

Нямецкая прэса вельмі горача зацікавілася магчымым разрывам адносінаў між Англіяй і Радамі. Нямецкая прэса перш усё баіцца, што Англія—у разе канфлікту—рашуча паставіць Нямеччыну перад дамаганьне, каб — выбіраў паміж Англіяй і СССР.

Нямецкая прэса на гэтае найцікаўнейшае пытаньне: які-ж будзе гэты выбар Нямеччыны?—адказывае розна. Адна з уплывовых газэтаў піша, што „Англія ў сваей процірадавай акцыі будзе апірацца пераважна на Польшчу, адвярнуўшыся ад Нямеччыны, да якой неяк ахаладзела ад самага ўзнаўленьня—пасьля Лёкарна—Трактату Нямеччыны з Радамі".

Можна быць пэўнымі, што другі раз фатальнай абмылкі — вайны проці Расеі, ад якой заўсёды перасьцерагаў Бісмарк,—немцы ня зробяць...

Немцы занепакоены англійска-польскім зближэньнем.

Нямецкая прэса, абгаварываючы спатканьне мін. Штрэзэмана ў Ніццы з англійскім дыпляматам Абэрнонам, выказывае вялікае занепакоеньне з прычыны быццам далёка зайшоўшага зближэньня між Польшчай і Англіяй, якое можа пашкодзіць Нямеччыне ў часе сэсіі Рады Лігі Народаў. Нямецкая прэса піша, што Англія павінна добра зразумець, наскольні сільнейшым і важнейшым для Англіі саюзьнікам на Усходзе зьяўляецца Нямеччына.

Нябывалы выпадак у Белградзкім парляманьце.

У часе дыскусіі над інтэрпэляцыяй клюбу сялянскай харвацкай партыі — у справе гвалтаў урадоўцаў мініст. унутраных спраў, здарыўся выпадак, яшчэ нябывалы ў гісторыі старых парляментаў. У часе прамовы міністра, які даводзіў, быццам ніякіх гвалтаў з боку паліцыі і адміністрацыі няма, некалькі апазіцыйных паслоў унясьлі на руках у салю паседжаньня паўжывога чалавека, зьбітага да крыві паліцыяй.

Добра выхаваны п. „ПАТ" божыцца, быццам гэты... „агідны" паступак апазіцыі выклікаў страшэннае абурэньне сярод большасьці югаслаўскага парляманту, паседжаньне якога было зараз жа зачынена.

Нешта падобнае, памятаецца, здарылася і ў другім—маладзейшым парляманьце, дзе на стол перад міністэрскімі лаўкамі была кінута залітая крывёй сарочка аднаго з паслоў.

Трэба было спадзявацца.

Даўно ўсім ясна, што фактычным каралём-самадзержцам зьяўляецца ў Італіі Мусоліні, які „церпіць" афіцыяльнага караля, як вельмі патрэбную яму ляльку, пазбавіўшы яго толькі... усялякага ўплыву! Памятаем, як некалькі разоў Мусоліні пагражаў каралю — за непаслухмянасьць волі дыктатара — пасадзіць караля пад замок, і пазбавіць трону. А вось, цяпер лёнданскія газэты падаюць сэнсацыйную вестку аб змове прыхільнікаў Мусоліні, якая мела мэтай скінуць караля з трону. Галавой змовы быў генарал Бальбо, былы камандзір усей фашыстаўскай міліцыі, а цяпер—міністар авіяцыі (лётніцтва).

Змова выкрыта афіцэрам генаральнага штабу, які—якраз у дзень, калі меў адбыцца пераварот, — увёў сэкрэтным загадам у сталіцу верныя каралю войскі.

Барацьба за вызваленьне Кітаю.

Заява кантонскага міністра Чэна.

У гутарцы з англійскім карэспандэнтам міністар замежных спраў кантонскага ўраду Чэн заявіў:

„Мы падпісалі з Англіяй умову (аб канцэсіях у Ханькоў), якая можа ня зусім здаваляе нас, але наагул — карысную. Можна было-б лічыць яе першым крокам на новым шляху паразуменьня, калі б не бясспынныя высадкі англійскіх войск у Шанхаі...

У Шанхай едуць і едуць англійскія войскі, і гэта выклікае злоснае абурэньне навет у тых, да каго не дайшла яшчэ наша прапаганда. Трэба зразумець, што цяпер паяўленьне чужаземных войск у Кітаі ўжо больш не выклікае ніякага страху, але наадварот—выклікае толькі злосьць ды абражае нацыянальную амбіцыю... Мы маем вялікія ўплывы на работнікаў, але мы нічога ня можам зрабіць, каб яны пакарыліся гэтаму наезду чужаземных войск, якога ня бачыў Кітай ад пачатку сьвету. У Шанхаі мы пакуль што ўлады ня маем. Але трэба зразумець, што ёсьць два Шанхаі: адзін—кітайскі, за які мы можам ручацца, а другі—чужаземны, міжнародавы, які прыход няпрошаных гасьцей—англійскіх войск—абярнуў бы ў вулкан, гатовы да страшэннага выбуху"...

З далейшага відаць, што ў гэтым „другім Шанхаі" вялізарную ўладу маюць сілы, якія заінтэрэсаваны ў тым, каб справакаваць вайну між Кантонам і Англіяй... Гэтая небясьпека правакацыі — настолькі вялікая, што ўсе высілкі Чэмбэрлена і... Кантонскага ўраду ня здолеюць, можа, яе зьліквідаваць... „Ворагі нацыянальнага кантонскага ўраду (ясна: англійскія дый іншыя чужаземныя прамыслоўцы - жываеды, разжырэўшыя на амаль-што не дармовай працы кітайскіх работнікаў, якіх кітайскі дыплямат з ветлівасьці тактычна аддзяляе ад п. п. Чэмбэрленаў!) пэўна скарыстаюць з добрае нагоды, каб справакаваць рэчы, якія пасьля паставяць у віну нашай уладзе... Абурэньне кітайскага народу—страшэннае. Але яго ўсьцяж далей раздуваюць ворагі Кантону і праціўнікі мірнай палітыкі п. Чэмбэрлена. Калі-б мы занялі Шанхай, дык гэтая небясьпека можа-б і спынілася зусім: толькі мы можам злагодзіць народнае абурэньне... Мы гэтага-ж і хочам. Але англійская армія — у руках нашых ворагаў—можа адным махам разьбіць і нашу добрую волю, і—усе высілкі Чэмбэрлена і—усе магчымасьці ратунку...

„Як гэта ні дзіўна, але цяпер такія часы, што жыцьцё і маемасьць чужаземцаў знаходзяцца ў большай небясьпецы пад аховай чужаземных войск, чым калі-б яны былі пад аховай нашых арміяў... Але ахоўваць нашых гасьцей мы можам і будзем толькі тады, калі мы будзем гаспадарамі ў сваім доме...—А цярпець, каб надалей нашыя госьці прыводзілі з сабой — дзеля аховы — азброеных жаўнераў ды браняносцы, мы больш ня будзем"...

Як выконываюцца казьні „агітатараў" у Шанхаі.

„Кітайскія" (англійскія) ўлады ў Шанхаі робяць усё, каб выклікаць ненавісьць да англійцаў і — прыхільнасьць да Кантону... Тэрор шалее нячуваны. Па вуліцах места ходзіць кат з атрадам сваіх памочнікаў і сам на мейсцы судзіць „даразным судом" схопленых „агітатараў-камуністаў". — „Суд" выяўляецца ў тым, што схопленаму забастоўшчыку кат тут-жа сячэ шабляй галаву, якая зараз-жа падвешываецца на ліхтарні ці тэлеграфным слупе, каб усе бачылі „сілу ўлады"...

Забастоўка ў Шанхаі зацягнулася.

Рада шанхайскіх работніцкіх дэлегатаў сьпярша абвясьціла забастоўку на 3 дні. Але цяпер забастоўка зацягнулася надаўжэй. Гэты працяг выкліканы перадусім тэрорам кітайска-англійскіх уладаў проці „агітатараў". Так бывае заўсёды—у глыбокіх народных рухах.

Здрада ў лоне „паўночных арміяў".

Аказываецца, што тыя дзьве кітайскія кананеркі, якія пачалі раптам бамбардаваць склады амуніцыі пад Шанхаем, належалі да паўночнай арміі (проці-кантонскай). Але матросы на іх збунтаваліся проці афіцэраў, захапілі каманду і пачалі паліць па англійскіх арсэналах, каб выклікаць іх выбух. Пад пагрозай француcкіх браняносцаў кананеркі адыйшліся ў бок Кантону — на злучэньне з падыходзячымі чырвонымі войскамі...

Чанг-Тсо-Лін і Ву-Пэй-Фу.

Чанг-Тсо-Лін, прыняўшы „вярхоўнае" камандаваньне над усімі проці-кантонскімі арміямі Кітаю, паслаў ультыматум галоўнаму камандзіру войск Сярэдняга Кітаю, ген. Ву-Пэй-Фу (англійскаму найміту), прапануючы яму сваю дапамогу пад варункам — пад-

---

каля гораў трупаў—ахвяр голаду і будавалі спакойна свае палацы ў эўрапэйскіх кварталах Калькутты, якія назвалі „белым горадам".

Але як-жа запылалі вы гневам у часе паўстаньня сіпаяў?

— „Эўрапэйскі квартал у Калькуце ня „белым", а „крывавым" звацца павінен!" — ускрыкнуў у думцы сваей капітан Асока, — „ўвесь ён пабудаваны з нашай індускай крыві і за нашую працу"...

А што далі англічане індусам агулам?

І, як-бы ў адказ на гэтае пытаньне, успомніліся яму абразкі ў далёкай і блізкай мінуўшчыне.

У пушчах бэнгальскіх водзіцца многа розных вялікіх вужак і дзікіх зьвяроў. Найстрашнейшым, аднак, з іх зьяўляецца прагавіты на кроў бэнгальскі каралеўскі цігр. Ня раз ён цягае скаціну, але, спаткаўшы чалавека, ня мінае і яго.

Раз спрабаваўшы чалавечага мяса, цігр пачынае паляваць на людзей сыстэматычна і выключна. Індускі народ, якому насіць агнястрэльнае аружжа англійцамі строга забаронена, бяссільны змагацца проціў гэтага зьвера; у кожнай амаль сям'і, што жывець недалёка ад бэнгальскіх пушч, забіраець ён сваю крывавую дань.

Сям'я Асокі таксама яе ня мінула. Капітан адчуў гэту кару на сабе балюча, горка. Цігр забраў у яго родную матку, забраў на чацьвертым годзе яго жыцьця.

З гэтага часу мінулі ўжо трыццаць два гады, а ўспамін аб ім і цяпер абдаў капітана Асаку холадам. Ен пачуў сябе ізноў малым хлопчыкам, убачыў матку сваю, як жывую.

Добра яму і весела было з ею. Прытуліўшы яго да сябе, баяла яна яму дзіўныя казкі, сьпявала прыгожыя песьні. У гарачы дзень купала яна яго ў халоднай вадзе і хавала ў цень.

Але вось, раз яны пайшлі з ею ў госьці да яго дзеда. Ісьці трэба было сьцежкай праз зарасьлі. Штосьці затрашчэла раптам і зараўло з боку гэтай вузкэ дарожкі,—момант адзін — і вялікі паласаты кот упіўся сваімі страшнымі зубамі ў цела жанчыны. Тая, абліваючыся гарачай крывёй, крыкнула слаба і сьціхла на векі.

Што было ў гэты трагічны дзень з ім больш? Як ён трапіў у хату к дзеду? Дарэмна сіліўся ўспомніць Асока.

Высокі бамбук скрыў скора сьцежку, па якой ужо ніхто з індусаў не асьмеліўся больш нікуды ісьці; маленькі калісь хлопчык даўно ўжо мужчына, даўно споўніў ён лятунак сваіх дзяцінных гадоў і мае права насіць агнястрэльную зброю; у руках з ёю ня страшны яму ніякі зьвер апрача чалавека; а цігры і сягоньня бяруць у індусаў сваю штодзенную дань — шырокім індускім масам агнястрэльная зброя і цяпер забаронена.

А яны, гэтыя рослыя здаровыя азброеныя з ног да галавы бэнгальцы, едуць куда?.. Можа на аблаву на ціграў і леапардаў? Можа бараніць бедных земляробаў ад вызыску бяздушных зэміндараў,[1] ці судраў і парыяў ад паняверкі ўсіх іншых каст?

Даўно ўжо гэтыя і падобныя ім пытаньні прыходзілі ў галаву капітану Асоцы; даўно ён задумваўся над лёсам Індыі і індусаў, прыслухоўваўся да навукі Гандзі і Даса, чытаў агнёвыя рэчы Рабіндраната Тагорэ, сачыў за падзеямі ў Расеі, Турцыі і Кітаю; але ніяк ня мог рашыць, па якой дарозе мае ісьці Індыя.

Тактыка Індыі з яго навукай непраціўленьня злу—ня новая і ніколі не давядзе да патрэбнай мэты: вызваленьня ад вызыску чалавека чалавекам, клясы беднай клясай багатай, — як не патрапіла зрабіць гэтага і хрысьціянства.

Тактыку Даса хітрыя англійцы патапілі ў моры крыві фанатычнай братабойчай вайны паміж індусамі брамінамі і індусамі магамэтанамі. Рабіндранат Тагорэ ці-ж даў якуюсь тактыку, паказаў практычную дарогу?..

І чакаў Асока, што вось паміж індусамі зьявіцца чалавек новы, сьвежы; у сваіх думках і працах ператочыць і сплавіць ён усе лепшыя думкі і мысьлі, да якіх дайшлі справядлівейшыя адзінкі ўсей людзкасьці на кулі зямной—аж да апошняга часу, дадасьць да іх усё тое, чым жывець і аб чым марыць чатырыста мільёнаў беднай працоўнай масы індускага люду, і, узяўшы назад з горну мысьлі сваей гэты дарагі матар'ял, створыць з яго паходню, якой ніхто ня бачыў яшчэ.

І ўзгарыцца гэтая паходня над усей Індыяй і асьвеціць народу індускаму дарогу да славы і шчасьця; а як люд пойдзе на гэтай дарозе, як дапнець сваей мэты, — аб гэтым ён ня думаў ніколі.

І чаго-ж дачакаўся?

На загад бяздушных ангельскіх банкіраў, яго, як машыну, вязуць кудысьці далёка з роднага краю, вязуць тушыць кітайскі пажар, гасіць агонь справядлівай помсты за той нялюдзкі зьдзек, які прынясьлі ў Кітай з сабой эўрапэйцы,—гасіць агонь, якім запылаць павінен быў-бы ўвесь можа сьвет...

* * *

Грыміць і грахоча па рэйках цягнік, сапець паравоз і плюецца агнём, пасьпяшаючы к назначанай мэце. Ня страшны яму шырокія рэкі й густыя канавы, ані цемра ночы; кілямэтры адзін за адным уцякаюць назад, а ён бяз упынку бяжыць усё ўпярод і ўпярод.

Але вось наастатку ўперадзе далёка блiснуў аганёк, за ім другі, трэці... Скора агні зьліліся ў вадно вялікае мора сьвятла, у блеску якога паказаліся высокія сілуэты багатых дамоў пераважна англійскага стылю.

Цягнік звольніў свой бег, каб скора затрымацца зусім.

— „Калькутта"... пракрычэў дзесьці ля сама паравозу кандуктар.

Салдаты пачалі апранацца і зьбіраць свае манаткі. Яшчэ некалькі хвілін, — і зайграўшы ражок сабраў і выстраіў іх на пэроне. Капітана Асокі аднак ня было ўжо між імі.

Дарэмна шукалі яго ў вагонах, дарэмна шукалі яго на вагзале: ён зьнік, як камфора.

* * *

Лёгка і радасна стала на сэрцы капітану Асоцы, як цягнік, сапучы і грукочучы, схаваўся ў начной цьме і пакінуў яго аднаго недалёка ад невялікай чыгуначнай станцыі. Поўнач была блізка, і ўсё ўжо дауно спала.

— „Туды, туды — на поўнач к берагам Ганга, а то і за Ганг" — прагаварыў ён ціха сам да сябе. — „Трэба пераждаць якісь час, пакуль будуць шукаць мяне ўсюды, а там, мой мілы чатырохсот-мільённы народ, я запалю тваю новую паходню, пакажу да зьдзейсьненьня тваіх ідэалаў дарогу пэўнейшую і карацейшую, чым тыя, якія выбіраў ты да гэтага часу. Яна можа ня будзе толькі наша індуская, але яна будзе агульна-людзкая. Не па душы яна можа будзе каесьце брамінаў і муніям, але, ідучы па ёй, працоўныя масы знойдуць права свае!..

„Пылай-жа, сьвяты кітайскі агонь, разгарайся! Што-раз далей і шырэй ахапі сабою ўсю Азію і ўвесь сьвет!..

— Хто ня страціў яшчэ сумленьня свайго, у кім тлеець хоць іскра праўды, у кім цячэць хоць капля чалавечай крыві, той ня пойдзе цябе тушыць!.." — крыкнуў ён ужо голасна і, павярнуўшыся на поўнач, зьнік у цемнаце ночы.

(Канец будзе).

[1] Зэміндары—зборшчыкі пазямельных падаткаў, за якімі ў 1794 годзе англійцы прызналі права ўласнасьці на зямлю іхніх падатных акругоў. Цяпер зэміндары тое-ж, што нашы абшарнікі.

чынецьня. Газэты пішуць, быццам у адказ на гэта Ву-Пэй-Фу... перайшоў на бок Кантону...
Ці гэта праўда, яшчэ ня сцьверджана.

Расклад арміі Фанга.

Разьбітая чырвонай арміяй армія англійскага найміта ген. Фанга зусім здэмаралізавана. — Яе недабіткі, уцякаючы, пачалі грабіць ды забіваць мірных людзей у местах і вёсках. Шмат жаўнераў расстраляны ваеннымі судамі за гэтыя грабяжы, але падняць ізноў дысцыпліну ў войску ўжо немагчыма.

Чанг-Тсо-Лін рашуча „ідзе на Шанхай"...

Англійскія газэты паведамляюць, быццам Чанг Тсо-Лін пастанавіў рашуча ісьці на ратунак Шанхаю. Ен быццам заявіў, што бярэ ў свае рукі каманду над усімі арміямі Паўночнага Кітаю, злучыўшыся і з „недабіткамі" арміі ген. Фанга. Галоўная кватэра Чанга будзе у Нанкіне. У Нанкіне цяпер стаяць усе штабы арміі Фанга, чакаючы там Чанга. У Нанкіне гэты разьбіты генерал Фанг зрабіў публічны даклад, у якім з плачам вінаваціў у сваім паражэньні сваіх афіцэраў... Цяпер ваенная роля гэтага ваякі скончана: сам Чанг ідзе ў Шанхай з 32.000-ным войскам, як галоўны камандзір. 22 і 23 прайшлі пад Шанхаем спакойна.

Брыян радзіцца ў Парыжу з англійскім паслом—у справе „супрацоўніцтва" ў Кітаі...

У Манчжурыі — пасьля ад'езду Чанг-Тсо-Ліна.

Газэты пішуць, што, як толькі Чанг-Тсо-Лін, дыктатар Манчжурыі, пакінуў гэты край, сьпяшаючыся на абарону ад чырвоных арміяў Шанхаю,—у яго царстве адразу пачалося хваляваньне, якое ў кожны мамэнт можа ператварыцца ў паўстаньне. Ведама-ж, газэты вінавацяць у-ва ўсім — сібірскіх ды кітайскіх бальшавікоў і камуністаў. Манчжурская паліцыя што-дзень раскрывае „змовы", робіць масавыя арышты, але рух усьцяж расьце.

На манчжурскай граніцы ўсьцяж расьце сіла радавай арміі, якая ў патрэбны мамэнт можа націснуць дэлікатна на граніцу, каб дапамагчы сваім саюзьнікам у Кантоне...

Заявы чужых урадаў.

Паслы ўсіх дзяржаваў у Пэкіне выдалі адозву, у якой выражаюць перакананьне, што павадыры ваюючых арміяў Кітаю прымуць усе меры, каб у часе баёў жыцьцё і маемасьць чужаземцаў не пацярпелі крыўды,—бо гэта змусіла-б чужаземныя ўлады прыняць з свайго боку меры аховы і абароны. Гэткую-ж заяву зрабіў француські пасол у Шанхаі.

ХРОНІКА.

Няма ахвотнікаў... Прэзыдыум Рады Міністраў разаслала цэламу раду беларускіх дзеячоў запросіны на нараду, якая мела адбыцца ў мінулую нядзелю ў Варшаве з учасьцем адносных міністраў — у справе правядзеньня слаўнае „зямельнае рэформы" (правільней: „закону аб асадніцтве і парцэляцыі"). Аднак, ніхто з запрошаных беларусаў на запросіны не паехаў...

Дый ня дзіва: адносіны ўсяго беларускага грамадзянства бяз розьніцы партыяў да асадніцкай палітыкі ўраду—настолькі аднадушныя, што ніхто не наважыўся ісьці на супрацоўніцтва з урадам у гэтай галіне — супраць яўна варожага становішча народу.

Арышты ня спыняюцца. „Кур. Віл." падае вестку, што павятовы камандант паліцыі ў Дзісьне заарыштаваў Балеслава Курпезу, зямляроба, вызнаньня рым.-каталіцкага, нацыянальнасьці беларускае, западозранага ў „беларуска-камуністычнай агітацыі". Курпеза жыў у засьц. Васькова, Празароцкае гміны. Справу яго вядзе сьледчы судзьдзя ў Глыбокім.

Чарговая лекцыя. Напамінаем, што чарговую лекцыю ў Цэнтр. Гуртку Т-ва Бел. Школы (вул. сьв.-Ганны 2) будзе чытаць у гэту суботу, 5-га сакавіка, грам. Зянюк — на тэму аб зямельным пытаньні. Пачатак лекцыі ў 7 гадз. ўвечары.

Ахвяры для музэю. Урад Беларускага Навуковага Т-ва гэтым дзякуе грамадзянам за ахвяраваныя для музэю ім. Ів. Луцкевіча рэчы: 1) грам. Язэпу Драздовічу—за старасьвецкі жаноцкі гарсэцік; 2) грам. Татарыну—за 2 медныя манэткі. У Т-ва паступіў слоўнікавы матар'ял, запісаны грам. Яз. Драздовічам.

Толькі цяпер! Толькі цяпер — цераз сем гадоў ад апошніх ваенных падзеяў на нашай зямлі — урад бярэцца за адбудову прыфронтовае паласы! Адбудова мае быць важнецкая: хаты будуць ня з дрэва (бо яго, бачыце, для сялян нямашака!), а — глінабітныя. Грошы за пабудаваныя для сялян хаты будуць залічаны, як пазыка, на 12 гадоў з аплатай працэнтаў па 5 гадавых.

Аб адкладзе ваеннае службы. Толькі цяпер польская прэса публікуе паведамленьне, што просьбы аб адкладзе адбываньня ваеннае службы для адзіных карміцьцаў сям'і (арт. 53-а), а так-жа з арт. 53-б прымаюцца ад... 15 лютага ў гмінных урадах—да дня, у якім распачынаюць сваю працу рэкруцкія камісіі.

Безработных усьцяж прыбывае. Паводле ўрадовае статыстыкі, за апошні справаздаўчы тыдзень лічба безработных у Вільні і Нова-Вілейску ўзрасла ўжо да 5.162 душ і ўсьцяж павялічваецца.

Забастоўкі. Надовячы ў Вільні забасталі работнікі шклянае гуты на Кальварыйскай вул., дамагаючыся павялічэньня заработнае платы на 30 проц. Бастуе 280 душ.

Дырэкцыя рашуча адмовілася споўніць слушнае дамаганьне работнікаў. Аднак, перагаворы між старонамі ня спыніліся.

Забастоўка шавецкіх работнікаў, якая распачалася 22-га лютага, дагэтуль ня спынена, ня глядзячы на пасрэдніцтва інспэктара працы. Шавецкія работнікі трэбуюць таксама 30 проц. дадатку да платы.

Парадкі ў вастрозе на Стэфанаўскай вуліцы. Як нас паведамляюць, адміністрацыя вастрогу на Стэфанаўскай вул. змушае адміністрацыйна караных грамадзістаў пасыпаць пяском дарожку, дзе мае гонар спацыраваць сабака пана Начальніка, а так-жа каўзіньку для дзетак п. Начальніка.

Няўжо-ж гэта праўда?!

Падзяка. Баранавіцкі Павятовы Камітэт Белар. Сялян.-Работ. Грамады шчыра дзякуе за ахвяры на палітычных вязьняў: грамадзянам вёскі Дурневічы за 7 зл. 35 гр., грамадзянам вёскі Мародзічы — за 12 зл. 75 гр.

Афіцыяльны курс грошы на 4 сакавіка. Даляр — 8 зл. 89 гр. Залаты рубель — 4 зл. 58 гр.

4./III. на чорнай біржы ў Вільні за даляр плацілі 8,90. Зал. р. 4,70 Чырв. 3 дал. 90 цэн.

Пісьмо у Рэдакцыю.

Паважаны грам. Рэдактар! Будзьце ласкавы зьмясьціць у Вашай паважанай часопісі наступнае:

У № 7 (16) газэты „Наша Справа" была зьмешчана карэспандэнцыя з вёскі Кучкуны, у якой пісалася, што сын Ракаўскага сьвяшчэньніка дэкляраваў кучкунцам выстарацца беларускую школу, калі яны дадуць яму складчынай капу яек і яшчэ якіхсь прадуктаў. Вымаганы гасьцінец быццам быў дадзены, а школы й дагэтуль няма. Заметка канчаецца словамі: „Відаць, яблычка ад яблынькі далёка ня коціцца".

У інтарэсах справядлівасьці, лічу за свой абавязак высьветліць справу, як яна ёсьць.

Мінулай весеньню вучань Радашкоўскае Беларускае Гімназіі Міхась Сеўба зьвярнуўся да мяне з запытаньнем, як памагчы кучкунцам адчыніць беларускую, хоць прыватную, школу, аб чым яны неадиакроць прасілі яго бацьку-сьвяшчэньніка Ракаўскага прыходу. Я парадзіў напісаць ад імя жыхароў вёскі аднаводнага зьместу заяву і прыслаць яе ў Радашкоўскае Т-ва Беларускае Школы. Неўзабаве гэтая заява з подпісамі жыхараў в. Кучкуны была Т-вам атрымана і зараз-жа скіравана ў Галоўную Управу Т-ва Бел. Шк. у Вільні.

Зразумела, што школы кучкунцам не далі, як не далі яе і ўсім беларусам пад Польшчай. Але вінаваты ў гэтым М. Сеўба столькі хіба, сколькі вінаваты сам той карэспандэнт, што Бог яму зусім ня даў сумленьня. Камок гразі кінут у сям'ю айца Сямёна ня йначай, як брудней рукой правакатара, бо сьвяшчэньнік Сеўба вядомы тут, як адзін з нямногіх сьвядомых сьвяшчэньнікаў-беларусаў.

Прымеце выразы пашаны й паважаньня.

Язэп Гаўрылік.
Сэкрэтар Т-ва Беларускае Школы ў Радашковічах.

З жыцьця Горадні.

× **Вось дык „зьезд"!** Колькі ўжо нашае беларускае грамадзянства бачыла на сваей роднай зямельцы розных платных агентаў, якія, цягаючыся з вёскі да вёскі, з места да места, стараліся абаламучываць тады яшчэ нясьведамых беларусаў і тэрарызаваць працаўнікоў беларускага руху ў Горадзенскім павеце! Ды ўсё ім неяк не шанцавала. А всеь сёньня калі па „Грамадзе" зроблены ўладай удар, гэтыя тыпы зноў аджылі і заварушыліся. Прыехаў з Вільні „доктар" Паўлючок, сабраў гэтую мілую яму кумпанію, дый кажа: „братва! не рабей: манета ёсьць! Толькі сьцягайце з павету сялян: будзем адчыняць „хатку" для барацьбы з грамадзістамі".

Братва — „рад-старацца, гаспадзін прэзэс"! дык кінулася па вёсках шукаць дурняў. Паезьдзіўшы штось з тыдзень і не знайшоўшы ні аднаго дурня, заселі ў габінэце над „Праўдзівай Польскай" і ну радзіць дый мяркаваць, як гэта ім зьезд гэты зрабіць — ды без сялян?.. Дый надумалі: што кожны прывядзе на дзень зьезду ў „Польскі Готэль" па пары сабутыльнікаў і падасьць іх як „сялян" што прыехалі з павету на зьезд.

„Сказано—сдѣлано".

Настаў дзень зьезду. Пацягнуліся з усіх куткоў места самыя — як гэта палякі кажуць: „мочыморды", а Паўлючок стаіць, паціраючы рукі, ды, нібы ня ведаючы, сур'ёзна пытаецца кожнага: скуль ці з далёк прыехаў? Кажуць: з „вёскі", — хоць гэтыя людзі мо' і ня бачылі вёскі. Стаю і я ды гляджу, што далей будзе. Аж бачу: ідзе знаёмая асоба з Новай Пасядласьці. Я, зацікаўлены, што ён адкажа, як яго будуць пытацца, падыйшоў бліжэй, ды чую: кажа „прыехаў з вёскі Кірневічы, як дэлегат ад сялян на ваш зьезд". І прозьвішча таксама другое падаў...

Так вось гэтыя Горадзенскія тыпы, як прадстаўнікі нібыто ад сялян з павету, за добрую закуску і выпіўку, якую ім Паўлючок зрабіў на „зьезьдзе" (бо выпіўка і закуска каштавала 250 зл.), вынесьлі пастанову „беспашчадна" змагацца з „Грамадой". А гадзіне 2 усе ракам павылазілі з гэтага „Готэля" — з цьвёрдай верай у тое, што гэта яшчэ не апошняе...

Сьмяяцца хочацца, гледзячы на гэтую камэдыю! Бо працоўнага селяніна і работніка ўжо не ашукаюць ані „доктар" ані яго агенты.

× **Ізноў вобыск.** 14 лютага ў Горадзенскай Акруж. Управе Т-ва Бел. Школы быў зроблены вобыск. Заарыштавалі старшыню Язэпа Баліцкага. Пратрымаўшы да вечара, выпусьцілі. Затым праз тыдзень 21-га прышлі зноў, зрабілі вобыск; нічога не знайшоўшы, гэтым разам заарыштавалі сэкрэтара Зьмітрука Кулакоўскага, ды зараз-жа звольнілі — у гэты самы дзень.

Беларускае грамадзянства бачыць і трактуе гэты факт, як паход проці беларускай культуры і культурных дзеячоў. **Абух.**

Рэдакцыя беларускай гумарыстычнай часопісі „Маланка" пры пасрэдстве нашай газэты падае да агульнага ведама, што:

У апошнія часы рэдакцыя „Маланкі" адтрымлівае шмат лістоў, у якіх таварышы сяляне слушна скардзяцца, што „Маланка" пачынае зноў выхадзіць адзін раз у месяц.

Просячы прабачэньня, рэд. „Маланкі" адзначае, што гэта часовае зьявішча, стаўшае не па віне рэдакцыі, а вызванае вядомымі студнёвымі падзеямі, калі стэрорызованыя масавымі вобыскамі і арыштамі сяляне перасталі акуратна прысылаць падпісную плату.

„Маланка" існуе на срэдствы самых падпішчыкаў і ніякіх дапамогаў ні ад кога не адтрымлівае. Са зьменшаньнем ліку падпішчыкаў, рэдакцыя ня мела магчымасьці выпускаць сваю часопісь у студні і лютым больш аднаго разу ў месяц. Цяпер, калі лічба падпішчыкаў дасягла папярэдняга роўня, рэдакцыя, спадзяючыся на далейшую помач сваіх падпішчыкаў, зноў прыступае выпускаць „Маланку" два разы ў месяц.

Рэдакцыя горача просіць усіх паважаных грамадзян беларусаў падтрымліваць родную гумарыстычную часопісь, прысылаючы падпісную плату і коопту ючы новых падпішчыкаў.

Вышаўшы ў лютым м-цы № 2 „Маланкі" сканфіскаваны Камісарам Ураду, пры чым набор усяго нумару да гэтай пары апячатаны паліцыяй ў друкарні, што перашкаджае выхаду ў сьвет № 3 „Маланкі", які рыхтуецца да друку. Наступны № 4 выйдзе 15 гэтага м-ца.

Заклікаючы яшчэ раз складаць падпіску на „Маланку", напамінаем, што падпісная плата на год—8 зл.; на паўгоду—4 зл. і на тры месяцы 2 злот.

Адрэс Рэдакцыі: Вільня. Гэтманская вул. № 4. Рэд. „Маланка".

Карэспандэнцыі.

Спэктакль на вёсцы.

(Лідзкі пав.).

15 лютага ў в. Філевічы, Навадворскае гм., Лідзкага пав., быў адыграны спэктакль. Пастаўлены былі дзьве п'есы: „Зьбянтэжаны Саўка" і „Заручыны Паўлінкі". Ня можна моўчкі абыйсьці тых варункаў, пры якіх гэны спэктакль быў адыграны; два разы падавалася заява на дазвол, два разы за 60 вёрст трэба было схадзіць асабіста да п. Старосты ў Ліду. На заяву аб дазволе на 8/I і 19/I дазвол атрымалі 17/I; зразумела, што 8/I адыграць было ня можна, і спэктакль сталі ладзіць 19/I. Здаецца, усё йшло добра, сабралася шмат грамадзян, і калі гульня была гатова пачацца,—як сьнег на галаву, з шумам увалілася Навадворская паліцыя і па салі прагучэла: „rozejść się, niewolno"! Паказаны дазвол ад Старосты быў схаваны паліцыяй у кішаню, глядзельнікі з салі выдалены, сцэна разламана, абвесткі пазрываны і ад спадзяванага вясёлага гумару — ад гэткай здаецца нявіннай гульні — астаўся толькі боль у сэрцы.

Прышлося зноў клапаціцца аб пазваленьні, і вось 15/II, калі ня было ніякай надзеі і не рабілася нат падгатоўкі, за пару гадзін да змроку, неяк прыпадкова дазвол быў атрыманы. Раптоўна сталі зьбіваць сцэну, зьбіраць артыстаў, і, хоць у акалічныя вёскі паведаміць не пасьпелі, — глядзельнікаў сабралася шмат. П'еса „Зьбянтэжаны Саўка" была згуляна артыстычна. Некатарыя ролі ў „Заручынах Паўлінкі" вышлі слабей, але гэта не псавала добрага ўражаньня. Наагул, былі здаволены ўсе, ня кажучы ўжо аб глядзельніках. Нат, сур'ёзньня паліцыянты праясьніліся, і здавальняючая ўсьмешка ня сходзіла з іх варожых твараў.

Гледзячы на высілкі моладзі, якая імкнецца да сьвятла, бачучы здаволеныя твары глядзельнікаў, мне ўспомніліся словы беларускага гімну: „Ад веку мы спалі і нас разбудзілі!"—Само сабою напрашваецца пытаньне: няўжо-ж беларус з такім высілкам збудзіўся толькі на тое, каб здалёк глянуць з цемры на сьвет, а потым зноў памерці? Але-ж гэта нат нелягічна і нязгодна з прыродай, у каторай усё збудзіўшаеся мае права на жыцьцё, падобна маладой расьлінцы, каторую прыцісьнула зваліўшаяся старое дрэва, спад якое яна ўсе-ж такі працягнулася па зямлі ці, скорчыўшыся ў дугу, прадаўжае расьці і зелянець. Беларуская вёска ўбачыла сваю цемру і з высілкам імкнецца да сьвятла! **І. Адзін.**

Зьвягуюць.

(м. Баранавічы, 27 лютага 1927 году).

У Паўлюкевічаўскай газэце „Беларускае Слова" з 17.II № 5 пад загалоўкам „Баранавіцкія" была зьмешчана карэспандэнцыя, у якой сказана, што Баранавіцкі Павятовы Камітэт Б. С. Р. Г. фальшаваў подпісы на дэклярацыях асоб, паступаючых у Грамаду, і такія фальшывыя дэкляpацыі пасылаў у Цэнтральны Сэкратарыят у Вільню, адкуль высылаліся сяброўскія білеты, і што такім фальшаваньнем дэклярацыяў і тлумачыцца такі шпаркі рост Грамады ў Баранавіцкім павеце.

Баранавіцкі Павятовы Камітэт Грамады пратэстуе супроць такой ні на чым не абаснованай зьвягі, а для выясьненьня шырокім масам з свайго боку падае наступнае: З 3.I с. г. па 15.I г. г. атрымана ад грамадзян розных куткоў павету каля 400 дэкляpацыяў (падпісаных давеpанымі асобамі), з якіх больш як 300 адпраўлена ў Цэнтральны Сэкратарыят у Вільню. Дзе знаходзяцца гэтыя дэкляpацыі, не вядома; факт той толькі, што да гэтага часу сяброўскія білеты на іх не атрыманы. Тым-жа, хто брэша аб фальшаваньні намі дэкляpацыяў, прапануем зайсьці ў наш Павятовы Камітэт (Баранавічы вуліца Шосова 155) і пазнаёміцца з подпісамі на тых дэкляpацыях, якія паступаюць да нас у вялікай колькасьці ўвесь час. Камітэт урадуе па панядзелкам, аўторкам і чацьвяргам што-тыдзень. Там-жа можна пазнаёміцца з тымі грамадзянамі, якія склалі дэкляpацыі і нямогуць дачакацца сяброўскіх білетаў. А такіх ёсьць ня мала, набярэцца іх у нашым Камітэце больш як 500 асоб.

Баранавіцкі Павятовы Камітэт Бел. Сял.-Раб. Грамады.

Куды дзяюцца нашы падаткі.

(Нясьвіжскі павет).

21 лютага ў м. Нясьвіжы ў акружным судзе разглядалася справа нейкага селяніна Сіняўскае гм., абвінавачанага ў богахульстве. Сьведкамі ў гэтай справе былі два паліцыянты №№ 1298 і 1304. Пасьля дапросу абвінавачанага і ўсіх сьведак суд вышаў на нараду. Тады паліцыянты падыйшлі да стала і пачалі пацііху гаварыць нешта сэкратару: сэкратар выслухаў іх і вышаў туды, дзе былі судзьдзі і пракурор.—Праз некалькі мінут ён вярнуўся назад усьміхаючыся і махнуў рукой на паліцыянтаў, якія, падышоўшы да стала, атрымалі грошы і, падзякаваўшы сэкратару, селі зноў на свае месца. Дык нейкі панок, відаць ім знаёмы (бо перад гэтым ён з імі вітаўся), запытаў: „Jakie to panowie pieniądze odebrali"? Паліцыянты адказалі, што атрымалі грошы, якія патрацілі на дарогу. Пры чым адзін з іх, усьміхаючыся, паясьніў, што ён за дарогу з Сіняўкі атрымаў 19 злотых, а другі за дарогу з Клецка 16 зл. І зноў усьміхнуўшыся кажа: „Ja jeszcze mam dobre sumienie, a ten pan to zawsze coś wykombinuje sobie". Але на гэтыя словы дык аж панок закруціў галавою, бо ўсякаму-ж вядома, што дарога з Клецка да Нясьвіжа каштуе 2 зл., а з Сіняўкі 4 зл.

Прадаюць сялянскія інтарэсы—і ня лысыя!

(Вялейская гміна, Вялейскага павету).

15 сакавіка 1926 г. у Вялейскай гміне, адбыліся таргі на пошту з двух каней на час ад I.IV 26 да I.IV-27, каторая і засталася за Кузьмой Бядрыцкім з в. Каловіцы, які згадзіўся дзяржаць яе за меншую цану. Згодна з умовай было пастаноўлена войтам і пісарам, каб той, хто трымае пошту, паставіў адну хурманку простую, а другую брычку рэсорную з пружынным сядзеньнем і скуранымі фартухамі, ды двух добрых каней. За гэта ўсё пабралі з сялян вялікія падаткі, якія так цяжка плаціць і бяз брычкі. Падаткі з нас набіраюць на брычку і скураныя фартухі, а іх і дагэтуль няма. Чаму? А вось чаму: Войт Ян Харэвіч паходзіць з Курaнецкай гміны за 10 вёрст ад Вялейскай гм., дык яму хадзіць дамоў надта далёка, а калі ехаць на паштовых канях, — дык трэба плаціць ад вярсты 20 гр. Дамоў-жа пану войту трэба даставацца абавязкава і то тры разы на тыдзень, бо трэба-ж даглядзець і гаспадаркі, якая складаецца з 40 дзесяцін зямлі. Вось, дзеля таго, каб не хадзіць пехатой па 10 вёрст і не плаціць па 20 гр. за паштовую хурманку, — не запатрэбаваў войт ад паштовага хурмана Бядрыцкага рэсорнай брычкі з фартухамі, за што апошні возіць яго па тры разы ў тыдзень дарма. Зусім добра згаварыліся. Войт езьдзіць дарма да хаты на простай хурманцы, а хурман не патрэбуе купляць лепшай брычкі з фартухамі, якая каштуе ня менш, як 400 зл. А падаткі, зразумела, сьцягіваюцца з сялян само сабой.

Той-жа паштовы хурман яшчэ лепш ухітрыўся. Ен паставіў на паседжаньні гміннае рады 10 бутэлек гарэлкі з добрай закускай, чым дабіўся ад раднікаў пастановы аб павялічэньні яму платы за паштовую хурманку яшчэ на 150 зл. І хваліцца пасьля, што 50 зл. страціў на выпіўку для радных, але за тое 100 зл. улажыў у кішэнь. А грошылі, ясна, адкуль: усё-ж з таго самага гаротнага селяніна ў відзе розных падаткаў.

Падглядчык Пэдслухоўскі.

Ніколі не зьніштажай сваей беларускай газэты! Прачытаўшы, давай суседу, ці знаёмаму, каб і ён пазнаў праўду аб жыцьці свайго народу і даведаўся, што робіцца на сьвеце!

Рэдактар-Выдавец: М. Машара.
Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая 22.